УДК 811.161.3'0'36

# АБ АКТУАЛЬНЫХ ПАДЫХОДАХ У ВЫВУЧЭННІ ГІСТАРЫЧНАЙ ГРАМАТЫКІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Хазанава К. Л., к.ф.н. дацэнт**
*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны,*
*Гомель, Беларусь*

Анатацыя: прапануюцца сучасныя спосабы прымянення інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій пры вывучэнні гістарычнай граматыкі беларускай мовы, што спрыяе больш глыбокаму засваенню дысцыпліны, а таксама павялічвае матывацыю навучэнцаў да знаёмства з гісторый мовы.

Ключавыя словы: гістарычныя граматыка, параўнальна-гістарычны метад, корпус мовы, інтэрнэт, электронны рэсурс, старажытны помнік.

# ABOUT ACTUAL APPROACHES IN THE STUDY OF HISTORICAL GRAMMAR OF BELARUSIAN LANGUAGE

**Khazanava K.L., assistant professor**
*Francisk Skorina Gomel State University*
*Gomel, Belarus*

Summary: modern ways of the use of computer technologies in the study of the historical grammar of the Belarusian language are proposed; that contributes to a deeper assimilation of the discipline, and also increases the motivation of students to get acquainted with the history of the language.

Keywords: historical grammar, comparative historical method, language corpus, internet, electronic resource, ancient monument.

Развіццё сучасных тэхналогій унесла шматлікія праўкі і ўдакладненні ў адукацыйны працэс. Сённяшнія маладыя людзі не ўяўляюць свайго жыцця без камп'ютарнай тэхнікі розных відаў, а некаторыя школьнікі і студэнты натуральна "не адліпаюць" ад сваіх смартфонаў. Заканамерным таму з'яўляецца зварот выкладчыкаў пры выпрацоўцы методык выкладання разнастайных дысцыплін да

інфармацыйных тэхналогій і ўключэнне тэхнічнай падрыхтоўкі навучэнцаў у вучэбны працэс па розных дысцыплінах і курсах, у тым ліку – і гуманітарных.

Не можа абысціся без інфармацыйных тэхналогій зараз і выкладанне філалагічных дысцыплін. Мэтазгодна прыцягваць інавацыйныя тэхналогіі да вывучэння гісторыі славянскіх моў, у прыватнасці – гістарычнай граматыкі беларускай мовы.

Гістарычная граматыка вывучае развіццё фанетычнай і марфалагічнай моўных сістэм, фарміраванне і змяненне слоўніка, трансфармацыі сінтаксічнага ладу мовы ад старажытнасці да нашых дзён. Такі вялікі часавы ахоп аб'екта даследавання вымагае азнаямлення з пісьмовымі помнікамі, захаванымі ад розных гістарычных перыядаў. Большасць старажытных рукапісаў і старадрукаў, што склалі духоўны скарб усходніх славян, засталіся ад мінулых стагоддзяў у адзінкавых экзэмплярах і беражліва захоўваюцца ў сховішчах бібліятэк розных гарадоў і краін. Вывучэнне моўных рыс культурных пісьмовых старажытнасцей для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей становіцца рэальным менавіта дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям.

Шматлікія помнікі старажытнарускай і старабеларускай мовы ў цяперашні час знаходзяцца ў алічбаваным выглядзе і прапануюцца на электронных рэсурсах. І вучні, і студэнты, маючы любы камп'ютарны сродак з магчымасцю выхаду ў інтэрнэт, лёгка становяцца гісторыкамі мовы, разглядаючы ў першасным (амаль) выглядзе алічбаваныя арыгіналы "Надпісу на Туматараканскім камяні", спісаў "Рускай праўды", "Статуты Вялікага Княства Літоўскага" і іншых помнікаў гісторыі славянскіх моў, што сталі крыніцамі вывучэння гістарычнай граматыкі беларускай мовы.

Даследаванне лінгвістычных асаблівасцей старажытных пісьмовых помнікаў дзякуючы камп'ютарным тэхналогіям адбываецца не толькі праз вывучэнне арфаграфічных і граматычных рыс твораў. Увага абавязкова звяртаецца і на адметнасці почыркаў рукапісаў і шрыфтоў старадрукаў, што таксама спрыяе больш грунтоўнаму вывучэнню гісторыі нашай мовы.

Важна заўважыць, што гістарычны моўны аналіз можна праводзіць у любым месцы, як на занятках у школе ці ва ўніверсітэце, так і дома, што, як паказвае час, бывае неабходна. Атрымаўшы тлумачэнні і кансультацыі з выкладчыкам, студэнты самастойна выкон-

ваюць заданні. Самастойная індывідуальная творчая праца ў абраны час і ў звыклых абставінах будзе матываваць студэнтаў да творчага асэнсавання атрыманых падчас лекцый і кансультацый ведаў. Пачынаць падрыхтоўку да даследчыцка-навуковай работы карысна ў школе. Пры вывучэнні старажытнай беларускай літаратуры мэтазгодна знаёміцца з выглядам першадруку твора і з моўнымі рысамі помніка.

Падчас школьнага навучання маладыя людзі знаёмяцца з асновамі інфармацыйных тэхналогій і валодаюць навыкамі стварэння мультымедыяпрэзентацый, якія павышаюць нагляднасць навучання і візуалізуюць тэарэтычны матэрыял. У адукацыйным працэсе ўніверсітэта студэнты філалагічных спецыяльнасцей паглыбляюць набытыя ў школе навыкі і вучацца прымяняць інфармацыйныя тэхналогіі менавіта пры выкладанні філалагічных дысцыплін. У сувязі з гэтым адным з відаў студэнцкай работы па вывучэнні гістарычнай граматыкі становіцца падрыхтоўка прэзентацый на розную тэматыку. У якасці тэм студэнцкіх прэзентацый можна прапанаваць: “Уклад беларускіх асветнікаў і дзеячаў беларускай культуры і літаратуры ў развіццё беларускай мовы”, “Развіццё фанетычных спецыфікацый беларускай мовы”, “Слоўнік беларускай мовы на розных гістарычных этапах”, “Фарміраванне лексіка-граматычных разрадаў (часцін мовы)”, “Гісторыя стварэння і моўныя рысы асобных помнікаў беларускага пісьменства”. Для прэзентацыі студэнты выкарыстоўваюць розныя фарматы, хаця самым папулярным працягвае заставацца MS Power point. У працэсе стварэння прэзентацыі студэнты паглыбляюць свае навыкі работы з камп’ютарнымі тэхналогіямі, што ўплывае на міжпрадметныя сувязі адукацыйнага працэсу. Акрамя таго, студэнты праводзяць самастойную даследчую работу па пошуку інфармацыі, моўным аналізе і аб’яднанні атрыманых звестак у адзінае цэлае. Такі від вучэбнай працы робіць станоўчы ўплыў на будучую выкладчыцкую дзейнасць сённяшніх студэнтаў-філологаў.

Важны фактар адукацыйнага працэсу – дыягностыка вучэбных дасягненняў навучэнцаў, што не абыходзіцца без правядзення тэсціравання. Гэты спосаб стандартызаванага вызначэння ўзроўню і структуры падрыхтаванасці мае станоўчыя і адмоўныя бакі. Аднак на працягу апошніх гадоў тэсты даволі трывала ўвайшлі ў вучэбны працэс большасці дысцыплін. Выкарыстоўваецца тэсціраванне і

пры вывучэнні гістарычнай граматыкі. Тэсты кантралююць засваенне як асобных тэм і раздзелаў, так і ўсяго курса, прапануюцца навучэнцам у папяровым друкаваным выглядзе, а таксама праводзяцца з прымяненнем інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій. У апошнім выпадку маецца больш магчымасцей для вар'іравання тэкставых заданняў. Пры гэтым адным з відаў замацавання вучэбнага матэрыялу па гістарычнай граматыцы з'яўляецца стварэнне тэставых заданняў студэнтамі, у працэсе чаго не толькі адбываецца паўторнае прачытанне тэарэтычнага матэрыялу, але і робіцца яго аналіз і сінтэз, што выражаецца ў фармулёўцы пытанняў і разнастайнасці варыянтаў адказаў. І такім чынам таксама адбываецца падрыхтоўка студэнтаў да выкладчыцкай дзейнасці і фарміраванне кампетэнтных канкурэнтаздольных спецыялістаў.

Выкарыстанне інтэрнэт-магчымасцей пры вывучэнні гістарычнай граматыкі беларускай мовы прымяняльна таксама падчас азнаямлення з тэндэнцыямі развіцця лексічнага саставу беларускай мовы. Даследаванне лексічных рыс старажытных помнікаў прыводзіць да вызначэння лексічных адзінак розных паводле крыніцы паходжання. Дакладную этымалогію і спрадвечна славянскай, і запазычанай лексікі лягчэй выявіць з дапамогай створаных беларускімі і рускімі мовазнаўцамі этымалагічных і гістарычных слоўнікаў, якія таксама ў вялікай колькасці прапануюць сховішча інтэрнэта. Вялікі патэнцыял у якасці крыніцы фактычнага матэрыялу маюць корпусы моў: напрыклад, беларускі N-корпус [1] або нацыянальны корпус рускай мовы [2].

Такім чынам, выкарыстанне актуальных інфармацыйна-камп'ютарных сродкаў і тэхналогій пры вывучэнні гістарычнай граматыкі беларускай мовы спрыяе больш глыбокаму засваенню дысцыпліны, а таксама павялічвае матывацыю навучэнцаў да знаёмства з гісторый нашай мовы.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Беларускі N-корпус [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bnkorpus.info. – Дата доступу: 05.09.2020.

2. Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ruscorpora.ru/new. – Дата доступа: 05.09.2020.